# Любоў
# ГАЛУБОВІЧ



кіраўнік, рэжысёр, вакалістка і артыстка Народнага тэатра гульні і гумару "Капыльскія пацехі"

**1962**

Любоў Пятроўна Галубовіч нарадзілася 5 жніўня ў в. Пацейкі Капыльскага раёна Мінскай вобласці. З дзяцінства выявіла артыстычныя здольнасці. Падчас навучання ў школе пісала сцэнарыі, брала ўдзел у культурна-масавых мерапрыемствах, спрабавала арганізоўваць гумарыстычныя інсцэніроўкі.

**1980**

Пасля сканчэння школы па парадзе маці атрымлівае адукацыю ў сферы харчовай прамысловасці. Аднак хутка вяртаецца да культурна-мастацкай дзейнасці — ідзе працаваць мастацкім кіраўніком у Слабада-Кучынскі СДК.

**1981—1988**

Паступае ў Беларускі дзяржаўны інстытут культуры і мастацтваў на факультэт культурна-асветніцкай работы. Вучыцца майстэрству анімацыі ў Л.І. Казлоўскай і рэжысуры ў П.А. Гуда. З атрыманнем кваліфікацыі "Арганізатар і метадыст культасветработы" накіроўваецца ў Капыльскі РДК, працуе метадыстам. Адразу пачынае выбудоўваць сістэму культурна-масавай дзейнасці ўстановы, зберагаючы і прымнажаючы набыткі папярэднікаў.

**1988—1991**

Працуе загадчыкам дзіцячага сектара ў Палацы культуры "Беларуськалій" у Салігорску, дзе атрымлівае каштоўны досвед, стасуючыся з масцітымі прафесіяналамі ў рэжысуры. У 1989-м выходзіць замуж і часова пераязджае жыць у Мінск, дзе працуе інспектарам па культуры Кастрычніцкага РВК. У 1991 годзе з новымі ідэямі і праектамі вяртаецца ў Капыль, дзе працуе мастацкім кіраўніком у Капыльскім РДК.

**1993**

Калектыў Капыльскага РДК пачынае актыўна ўдзельнічаць у форумах і конкурсах Мінскага АЦНТ, дзе хутка атрымлівае ўзнагароды і прызнанне гледачоў. Так, у 1993 годзе за распрацаваную Любоўю Галубовіч праграму "Капыльскія пацехі" калектыў здабывае I месца ў конкурсе культарганізатараў і ўжо ўсюды пачынае выступаць пад гэтай назвай. Пасляховасць ідэі стала падмуркам для стварэння аднайменнага тэатра гульні і гумару. У гэтым жа годзе Любоў Галубовіч займае пасаду дырэктара раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра.



На адным з канцэртаў, 2015 г.





Падчас святкавання 30-годдзя тэатра, 2023 г.



Калектыў тэатра на сцэне раённага цэнтра культуры

**1995—1998**

У 1995-м калектыў перамагае на Нацыянальным фестывалі народнага гумару ў Аўцюках. З 1996-га Любоў Галубовіч працуе загадчыкам аддзела культурна-масавай і метадычнай работы Капыльскага РЦК, працягвае кіраваць тэатрам. З'яўляюцца новыя гумарыстычныя пастаноўкі: тэатралізаваная пастаноўка па байках К. Крапівы "На грышчы ў Агаты", пастаноўка па матывах апавядання В. Шукшына "Да трэціх пеўняў", нават камедыя Я. Купалы "Паўлінка". Пад кіраўніцтвам Галубовіч тэатр гульні і гумару "Капыльскія пацехі" атрымлівае званне народнага (1996), у хуткім часе калектыў пачынае даваць сольныя канцэрты. У 1998 годзе з'яўляецца аднайменны абласны фестываль, які цяпер ладзіцца кожныя тры гады ў Капылі і збірае шматлікія аматарскія калектывы, паэтаў і самадзейных аўтараў Міншчыны на агульнае свята.

**2000—2022**

З'явілася шмат новых пастановак, сярод якіх музыкальныя праграмы "Вокны нашага дворыка", "Справы сямейныя", "Агародны рэлакс", "Дваццаты сольнік" і інш. Тэатр шматразова становіцца лаўрэатам у намінацыі "Тэатралізаваная гульнявая праграма" на абласным фестывалі гумару (2002, 2004, 2008, 2014, 2021). У 2021-м займае I месца ў намінацыі "Музыкальная пародыя" і II месца ў намінацыі "Тэатральная мініяцюра" на фестывалі народнага гумару "Аўцюкі". За прафесіяналізм і адданасць свайму тэатру Любоў Галубовіч неаднойчы атрымлівала ўзнагароды, сярод якіх ганаровая грамата Адміністрацыі Прэзідэнта, граматы Міністэрства культуры, Мінрайвыканкама, Капыльскага РВК і інш.

**2023**

Сёння Любоў Пятроўна працягвае кіраваць тэатрам, які за гады адданай працы стаў для яе сапраўдным другім домам. У красавіку на сцэне раённага цэнтра культуры яны далі традыцыйную праграму і адзначылі 30-годдзе з дня стварэння тэатра гульні і гумару "Капыльскія пацехі". За час свайго існавання калектыў арганізаваў больш за 160 канцэртаў, у тым ліку больш за 30 сольных.

Цяпер Любоў Галубовіч працуе над вялікай тэатральна-інтэрактыўнай пастаноўкай "Трыпціх", у сцэнарыі да якога будуць урыўкі з камедый "Паўлінка", "Несцерка", "Мікітаў лапаць". Яго прэм'ера адбудзецца напрыканцы сакавіка наступнага года.

Сакрэтам поспеху Любові Галубовіч з'яўляецца не толькі яе талент сцэнарыста і рэжысёра, але і здольнасць аб'ядноўваць вакол справы таленавітых землякоў, захапляць іх тэатральна-музычным мастацтвам і раскрываць іх творчы патэнцыял. Менавіта дзякуючы яе ініцыятыве ўзнік адзін з самых яскравых і пазнавальных народных тэатраў Беларусі "Капыльскія пацехі", а таксама аднайменны фестываль, які стаў месцам прыцягнення народнага гумару і ўзняў прэстыж Капыля. Спалучэнне традыцыйнага, класічнага местачковага гумару ў аўтарскай апрацоўцы Любові Галубовіч штогод дорыць гледачам незабыўныя ўражанні і жарты і даказвае, што народны тэатр можа ствараць сапраўды ўнікальныя і якасныя пастаноўкі.

Штогод 1 красавіка калектыў Народнага тэатра гульні і гумару "Капыльскія пацехі" ладзіць прэм'еру на сцэне раённага цэнтра культуры.